ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

'91

ЧАЦВЕР
7
ЛЮТАГА
№ 3 (1667)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА
ОРДЭНА
ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

# Спецвыпуск: ДЛЯ ЛІЦЭІСТАЎ, ПРА ЛІЦЭІСТАЎ

Ёсць, аказваецца, такая школа, якую на самой справе можна аднесці да школы будучага па яе незвычайнасці — гэта МІНСКАЯ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНАЯ ШКОЛА ПРЫ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА (НЕАФІЦЫЙНАЯ НАЗВА — ЛІЦЭЙ). Яна была заснавана 9 лютага 1990 года.

Ліцэй дае агульную сярэднюю адукацыю на павышаным узроўні па прафілюючых прадметах, прафесійную падрыхтоўку па спецыялізацыях пяці факультэтаў універсітэта: механіка-матэматычнага, прыкладной матэматыкі, фізічнага, радыёфізікі і электронікі і філалагічнага.

Праграмы па прафілюючых прадметах распрацаваны на кафедрах і зацверджаны на саветах факультэтаў універсітэта.

Для ліцэістаў ва універсітэце арганізаваны спецкурсы, спецсемінары, цыклы лабараторных работ, індывідуальныя заняткі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў ВНУ.

Перад навучэнцамі выступалі з лекцыямі загадчыкі кафедраў, прафесары Э. І. Звяровіч, П. П. Забрэйка, Ю. С. Харын, А. А. Лойка, А. Я. Супрун, дацэнт А. В. Самусенка.

Актыўна працуюць са школьнікамі А. І. Слабадзянюк, Г. У. Пальчык, А. П. Нячай, Л. Р. Марковіч, А. І. Цімошчанка, А. У. Лаўрыненка, М. А. Лысак, А. Э. Цітавіцкая, Д. І. Абрамовіч (фізфак), І. І. Варановіч, А. І. Таўгень, Ю. Д. Чурбанаў (мехмат), У. І. Зяньковіч, А. Я. Пятраеў, Ю. І. Варатніцкі, І. А. Шалатонін, В. М. Зелянкевіч, В. М. Малафееў (факультэт радыёфізікі і электронікі), Ч. М. Роліч, П. У. Глякаў, Б. В. Задворны, Д. В. Сінькевіч, В. П. Юферэў, Н. А. Карповіч, А. В. Дземідовіч, С. П. Бандарэнка, А. Д. Андрэеў, Л. Н. Батурына, Е. А. Жамжурава, І. І. Прыходзька (ФПМ), Л. К. Тарасюк, М. Р. Прыгодзіч, Я. М. Камароўскі, І. Э. Саўко, Е. А. Капусціна, М. В. Кныш (філфак).

Навучэнцы ліцэя дабіліся нядрэнных вынікаў на прайшоўшых гарадскіх алімпіядах па матэматыцы, фізіцы, рускай і беларускай мове і літаратуры, англійскай мове, дзе яны занялі пераважную большасць прызавых месц.

Каманда ліцэя заваявала права на ўдзел ва Усесаюзнай фізбітве. Рыхтавалі яе А. І. Слабадзянюк, А. Я. Пятраеў, Л. Р. Марковіч.

Ліцэю споўніўся год. Ёсць першыя поспехі, але існуе і шмат праблем на шляху станаўлення новай навучальнай установы. Наперадзе вялікая работа. Я жадаю поспехаў у вучобе ўсім ліцэістам — будучаму папаўненню універсітэта, творчай работы ўсім выкладчыкам, якія працуюць са школьнікамі.

А. ЖУК,
дырэктар МССШ пры БДУ
імя У. І. Леніна.

## ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН ВЫКЛАДЧЫКАЎ

# КОДЭКС ГОНАРУ

Я, настаўнік канца XX стагоддзя, глыбока ўсведамляю сваю адказнасць перад будучым нашым грамадствам, перад чалавецтвам: мой самы высокі абавязак у тым, каб дапамагчы стаць шчаслівым кожнаму майму вучню, садзейнічаць росквіту і развіццю жыцця на зямлі.

Дзеля выканання свайго найвышэйшага прызвання я буду імкнуцца:

— быць заўсёды і ўсюды узорам Чалавека для сваіх вучняў;

— стаць для сваіх вучняў старэйшым сябрам, заўсёды памятаючы аб тым, што яны маюць патрэбу менавіта ў старэйшым;

— заўсёды, нават у самых складаных абставінах, заставацца аптымістам у адносінах да кожнага майго вучня, змагацца за яго, праяўляць цярпенне ў чаканні вынікаў сваіх педагагічных намаганняў;

— змагацца за добрыя адносіны да дзіцяці ўсіх дарослых, што акружаюць яго;

— у сваёй педагагічнай дзейнасці выкарыстоўваць дасягненні навукі, вопыт калег, змагацца супраць коснасці, руціны і бяздушша ў школе.

## ЗАМЕСТ ВІНШАВАННЯ...

# ... Спадзяванні

На нашым святочным караваі ўсяго адна свечка, здольная разгарэцца яркім полымем у добразычлівай атмасферы ці згаснуць ад неасцярожнага дотыку. За год у жыцці ліцэя было дастаткова і таго, і другога.

Гэта добра, што ўсім нам дазволена паглыблена займацца любімай справай (матэматыкай, фізікай ці літаратурай). Ніхто не імкнецца нікому перашкаджаць. Не стамляюць нас заняткі па 80 мінут кожны. Раз у тыдзень мы амаль што студэнты, бо спецкурсы, інфарматыка і навучанне па прафілюючых прадметах праходзяць звычайна ў аўдыторыях універсітэта. Самы цяжкі для нас час — сесія. Дарэчы, іспыты мы здаём не толькі па спецыяльнасці, але і па любімаму для многіх з нас абавязковаму прадмету, які выкладае Вольга Іванаўна Гусянец,— харэаграфіі. Трэба дадаць, што амаль усе нашы настаўнікі — выкладчыкі універсітэта, акрамя таго, у нас чытаюць лекцыі многія загадчыкі кафедраў БДУ. А гісторыю сусветнай культуры мы вывучаем у мастацкім музеі. І за англійскую мову ўзяліся ўсур'ёз.

Але калі вы лічыце, што ліцэісты не бачаць свету за зубрэннем, то няма лепшага пераканання ў адваротным, чым нашы штомесячныя дыскатэкі ў Доме настаўніка, ПК «Юнацтва», ПК Белсаўпрофа.

Хутка наш дзень нараджэння. І ва ўсіх нас: настаўнікаў і вучняў адно запаветнае жаданне — працаваць пад адным дахам. Бо пакуль «філолагам» даводзіцца вучыцца пад музычны акампанемент вучняў СШ № 102 (з музычным напрамкам), а ўсе астатнія арэндуюць памяшканні ў СШ № 189.

Праблему гэту спрабавалі вырашыць гарсавет, праграма «Крок»... Цяпер нам абяцаюць выдзеліць да першага верасня будынак былой пятнаццатай школы, калі яе крышачку адрамантуюць і падмацуюць, каб выпадкам не разбурылася пад час заняткаў па харэаграфіі.

Вось і спадзяёмся мы, што наступны дзень нараджэння сустрэнем ва ўласным доме...

Марына АЖГІРЭЙ,
вучаніца 10 беларускамоўнага класа.



Малюнак Ірыны СЫС.

## СПРАВАЗДАЧА

# Вось так мы змагаемся

**Матэматыка — навука дакладная. Таму папярэджваем: не шукайце «лірыкі» ў паведамленні завуча па матэматыцы Юрыя Дзмітрыевіча Чурбанава:**

13 студзеня адбылася гарадская алімпіяда школьнікаў па матэматыцы. У састаў каманды ліцэя ўваходзіла 19 чалавек (ад 10-х класаў — 9, ад 11-х — 10).

Вынікі алімпіяды былі рознымі. Сярод дзесятых класаў нашы ліцэісты занялі ўсе прызавыя месцы: Кірыл Заркоў — першае, Аляксей Емяльяненкаў і Алесь Кастрыца — другое, Сяргей Кузьміч — трэцяе.

Няма чым пахваліцца прадстаўнікам адзінаццатых класаў. Ніхто з іх не дасягнуў прызавога месца. Лепшым быў Яўген Васільеў (клас 11 ПМ-1) — 18 балаў. затым Уладзімір Шэка — таксама яго аднакласнік — 16 балаў. За імі з невялікім адставаннем ішлі Вера Шаўчэнка (11 М-2) — 14 балаў і Сяргей Салаўёў (11 М-1) — 12 балаў.

Улічваючы тое, што наша каманда ўпершыню выступала на гарадской алімпіядзе, вынікі можна лічыць нядрэннымі.

А зараз да вашай увагі мініінтэрв'ю з пераможцамі алімпіяды.

*1. У чым вартасць алімпіяды?*

*2. Ваша жыццёвае крэда?*

*3. Што б вы жадалі атрымаць на спадачку з блакітнай аблямоўкай?*

Сяргей ЛАПКО (10 Ф-1):

1. Дух саперніцтва, які там прысутнічае.

2. Маё крэда — ніколі не сумаваць, не падаць духам.

3. Запрашэнне на вучобу ў Гарвардскі універсітэт.

Сяргей РАСАДЗІН (10 РФ-1):

1. Магчымасць праверыць сябе.

2. Не вешаць нос.

3. Шмат спадачкаў з блакітнай аблямоўкай.

Аляксей БОШАН (10 РФ-1):

1. У першым аркушы.

2. Быць на галаву вышэй за ўсіх.

3. Многа-многа ўсялякай усялячыны.

Марына АЖГІРЭЙ (10-Б):

1. Даецца магчымасць адзін раз у жыцці добра падумаць.

2. Усё, што ёсць, то добра. Лепш не бывае.

3. Дакумент аб залічэнні ва універсітэт.

Інга ПІНГАЛЬ (11-Б):

1. Выдатная праверка ведаў, магчымасць даведацца, хто ёсць хто.

2. Аптымізм і вера ў людзей.

3. Якую-небудзь цікавую паездку, так бы мовіць, у Італію, або ў Францыю. Матэрыяльныя даброты, я лічу, трэба дабываць самастойна.




Малюнак Ірыны СЫС.

# Цяжка ў вучэнні — лёгка ў баі

*— Ваш факультэт курыруе чатыры класы ліцэя. Якія надзеі ўскладваеце Вы на яго?*

А. П. КЛІШЧАНКА, дэкан фізічнага факультэта:

— Безумоўна, мы зацікаўлены бок і калі адказаць коратка, то факультэт чакае таленавітага папаўнення. Ёсць падставы спадзявацца на гэта.

Па-першае, ліцэісты атрымліваюць грунтоўную падрыхтоўку. Праграмы па прадметах, якія яны вывучаюць, істотна адрозніваюцца ад тых, што ў звычайных школах. Яны накіраваны на спецыялізацыю, звязаную з той ці іншай спецыяльнасцю.

Вазьміце, напрыклад, фізіку. У нашых сярэдніх школах сёння яна амаль што ў заняпадзе. У тыдзень на гэты прадмет адводзіцца максімум тры гадзіны. І ўсё. Распачалі гуманітарызацыю, насаджаем беларусізацыю. А карысці з гэтага? Што рабіць, у прыватнасці, таму, хто мае схільнасці да фізікі ці матэматыкі? Займацца самастойна не заўсёды ёць магчымасць, ды і адсутнасць сістэмы наўрад ці дасць жаданы плён. У ліцэі кожны займаецца тым, чым хоча. І фізікі шэсць гадзін.

Згаджаюся, нялёгка тут вучыцца, але нездарма ж, кажуць: «Цяжка ў вучэнні — лёгка ў баі». Ужо сёння можна сцвярджаць, што намаганні выкладчыкаў і вучняў не праходзяць дарэмна: на гарадскіх алімпіядах школьнікаў па матэматыцы і фізіцы ліцэісты паказалі нядрэнныя вынікі — многія з іх трапілі ў першую дзесятку.

Па-другое, задача тых, хто працуе тут (у асноўным гэта маладыя выкладчыкі, узрост якіх не на многа старэй, чым у падапечных), не толькі даць вучням праграмныя веды, але і прывіць дух універсітэцкай навукі, дапамагчы адчуць інтэлектуальную свабоду, выйсці з тых жорсткіх рамак, у якіх іх надзейна (толькі невядома, дзеля чаго) трымалі у школе. Думаю, дапаможа ў гэтым і тое, што частка лабараторных заняткаў і практыкумаў праходзіць ва універсітэцкіх лабараторыях і аўдыторыях.

І, нарэшце, па-трэцяе, аб чым рана сёння гаварыць, але што я буду адстойваць, наколькі змагу. Што іменна? Я глыбока перакананы: мы ніколькі не памыліліся б, калі б зрабілі для сваіх ліцэістаў льготы пры паступленні ў БДУ. Чаму б не залічваць ім адзнаку на выпускных экзаменах у ліцэі ў якасці адзнакі на ўступных іспытах ва універсітэт? Тут жа працуюць нашы выкладчыкі, і яны бачаць здольнасці кожнага вучня. Мяне пераконваюць, маўляў, калі чалавек здольны і «моцны» па якому-небудзь прадмету, то яму не цяжка даказаць гэта яшчэ раз. А навошта?

Запісала
З. АЛЯШКЕВІЧ.

# Спецвыпуск: ДЛЯ ЛІЦЭІСТАЎ, ПРА ЛІЦЭІСТАЎ

## Я ПЛЮС ТЫ

# Ліцэй... Як многа ў гэтым слове...

***Нашто спатрэбіліся звычайным школьнікам дадатковыя цяжкасці, якія абяцала ліцэйскае жыццё? Натуральна, каб праверыць свае сілы, набыць трывалыя веды. Можна вытлумачыць такі рызыкоўны ўчынак цягай да новага, нязведанага. І не толькі...***

«...я ўцякала са свайго «старога» класа, у якім вучыцца больш не магла. У ліцэі спадзявалася знайсці нармальныя чалавечыя адносіны».

**Віка КУЗНЯЦОВА.**

«Мне было цесна ў рамках праграмы звычайнай школы, абрыдзела яе аднастайнасць. А тут рызыкуеш быць адлічаным за непасняховасць, таму і не дазваляеш сабе расслабляцца».

**Дзіма КАЧАН.**

«У ліцэі кожны мае магчымасці для самавыяўлення, кожны — асоба. Тут усе сябруюць, дапамагаюць адзін аднаму. І выкладчыкі, і вучні, і адміністрацыя надзелены пачуццём гумару, што дапамагае пераадольваць цяжкасці».

**Іра МАРОЗ.**



«Мяне ўразілі адносіны настаўнікаў да вучняў: добразычлівыя, шчырыя».

**Сяргей САЛАЎЁЎ.**

«Тут я сустрэла цікавых настаўнікаў, сапраўдных майстроў сваёй справы. Упершыню за школьнае жыццё апынулася ў атмасферы даверу, шчырасці, дабрыні, узаемадапамогі. Захапілася цікавай справай...»

**Іра СЯМАШКА.**

«Тут сабраліся людзі, аб'яднаныя адной мэтай — вучобай. Тут умеюць вучыць. І гэтым усё сказана».

**Дзіма КАЧАН.**

Ці набылі навучэнцы ліцэя за год вучобы нейкія своеасаблівасці ва ўзаемаадносінах, знешнім выглядзе? Безумоўна. Знікла пытанне, чым заняцца ў вольны час, хаця і вольнага часу амаль не засталося. Упэўненасць у сабе, зацікаўленасць у вучобе...

«Звычайны школьнік адрозніваецца ад ліцэіста абавязковай формай адзення, тварам. Калі твар школьніка — дзённік, то ў ліцэіста твар знайсці цяжка».

**Дзіма КАЧАН.**

«Я думаю, што ліцэіст вылучаецца станам душы. Калі ў звычайнага школьніка яна запрыгонена, то ў ліцэіста — вольная. І таму ён ідзе на заняткі з лёгкай душой».

**Сяргей САЛАЎЁЎ.**

«Мы тут не проста Тані, Пеці, Сашы, а «матэматыкі», «філолагі», «фізікі».

**Іра СЯМАШКА.**

А вось што значыць ліцэй для Іры Сыс:

«І праз многія гады ён будзе выклікаць у нас нейкія асаблівыя пачуцці: такія ж ясныя, як вясенняе сонца... Я думаю, што наш ліцэй — гэта адна вялікая дружная сям'я. І хачу, каб яна ўвесь час мацнела».

Хіба можна сумнявацца ў тым, пастпаць у ліцэй ці не, быць ліцэю ці не, калі Іра Мароз, як, дарэчы, амаль усе яе аднакласнікі, сцвярджае: і калі б зноў паўстала пытанне: застацца ў школе ці паступаць у ліцэй, я, не задумваючыся ні на хвіліну, выбрала б ліцэй».

Такім чынам, выбар зроблены!

**Сам-насам з адкрыццямі ліцэістаў была Лера Мікітаўна РУБАШНАЯ, настаўніца беларускай мовы і літаратуры.**

**Малюнак Ірыны СЫС.**

## ДА АДКАЗУ — АДМІНІСТРАЦЫЮ!

***Часта нялёгка журналісту ўзяць самае звычайнае інтэрв'ю: даводзіцца шукаць, угаворваць, запэўніваць... Мне ж у гэтым сэнсе пашанцавала: для дырэктара першага ў Мінску ліцэя*** Аляксандра Іванавіча ЖУКА ***і настаўніка Фрунзенскага раёна*** Мікалая Валяр'янавіча КНЫША ***інтэрв'ю — справа настолькі ж звыклая, як заняткі для ліцэістаў. Мне засталося толькі задаць пытанні. І вось што з гэтага атрымалася...***

### ДЫРЭКТАР: «Я СТАЎ МНАГАДЗЕТНЫМ БАЦЬКАМ»

**Ліц.: Ці ёсць што-небудзь у гісторыі ліцэя такое, аб чым ведаеце Вы і нават не здагадваюцца ліцэісты?**

А. І.: Няхай гэта застанецца таямніцай. Так вам будзе спацца спакойней.

**Ліц.: Чаго сёння не хапае ліцэю?**

А. І.: Для сапраўднага шчасця? Утульнага ўласнага памяшкання.

**Ліц.: Што змянілася ў Вашым жыцці з таго моманту, як Вы сталі дырэктарам?**

А. І.: Я стаў мнагадзетным бацькам. Таму менш сплю, а на скронях з'явілася першая сівізна.

**Ліц.: Вы першы дырэктар ліцэя. Што б Вы параілі чалавеку, які калі-небудзь стане другім?**

А. І.: Адносіцца да ліцэістаў з пачуццём адказнасці за іх далейшыя лёсы.

**Ліц.: Самая вялікая нечаканасць, якую Вы атрымалі ад ліцэістаў?**

А. І.: Прызнанне ў каханні дзвюх ліцэістак ў першы ў гісторыі ліцэя Дзень Майскага Жука .

**Ліц.: Якая падзея магла б, на Ваш погляд, стаць «падзеяй года»?**

А. І.: Па-мойму, гэта барацьба за памяшканне для ліцэя, у якой мы перамаглі. А пасля ўсім вядомага выпуску «Крока» я стаў тэлезоркай: мяне пачалі пазнаваць на вуліцы.

**Ліц.: Ці сталі б Вы ліцэістам, каб выпала такая магчымасць?**

А. І.: Калі параўноўваць умовы навучання і атмасферу ў розных школах, я лічу, што з радасцю пайшоў бы ў ліцэісты. А здзейсніць гэтае жаданне, магчыма, зможа мая дачка Дар'я.

**Ліц.: Што дае ліцэй Вам як дырэктару?**

А. І.: Разуменне таго, што займаешся важнай і карыснай справай. А гэта, паверце, нямала.

**Ліц.: Чаго чакаюць ад дырэктара ў ліцэі?**

А. І.: Мне здаецца, ад дырэктара чакаюць шмат. Клопату, справядлівасці, павагі, шчырасці, дабрыні. Ну, а выпускнікі — дапамогі ў дасягненні станоўчых вынікаў — паступлення ва універсітэт.

### ЗАВУЧ: «ПА-ПЕРШАЕ, НАБЫЎ БУДЗІЛЬНІК...»

**Ліц.: Што змянілася ў Вашым жыцці, калі Вы сталі завучам і выкладчыкам у ліцэі?**

М. В.: Па-першае, набыў будзільнік. Па-другое, праклаў новы маршрут з Масюкоўшчыны ў Серабранку. Па-трэцяе, бачу свайго сына, калі ён спіць.

**Ліц.: На працы Вы часцей сутыкаецеся з вучаніцамі...**

М. В.: ...таму галіцца даводзіцца кожны дзень, у цырульню хадзіць часцей, ды і ўсміхацца шмат.

**Ліц.: Якія якасці павінны быць у выкладчыка-філолага ліцэя?**

М. В.: Дабрыня, шчырасць, уменне выслухаць і зразумець.

**Ліц.: У выніку конкурсу «Чалавек года» стала вядома, што Ваша імя карыстаецца надзвычайнай папулярнасцю. Як Вы гэтага дамагліся?**

М. В.: Дзякуючы сваёй жонцы-філолагу, якая за час маёй працы перакваліфікавалася ў хатнюю гаспадыню.

**Вяла гутарку Н. КОРСАК, ліцэістка.**

## ЛЮСТЭРКА

# Немаўля,

## або КАЛЕКТЫЎНЫ ПАРТРЭТ ЛІЦЭІСТА

**Да рэвалюцыі ліцэй быў прывілеяванай мужчынскай навучальнай установай. Хаця ліцэі ў асноўным мелі энцыклапедычны ўхіл, аднолькава вялікая ўвага надавалася і матэматыцы, і літаратуры, і праву. Праз дзевяць гадоў навучання выпускнік свабодна валодаў некалькімі мовамі. Менавіта ліцэі далі краіне шмат выдатных вучоных, паэтаў, юрыстаў, дзяржаўных дзеячаў.**

**Год назад адкрыўся першы сучасны мінскі ліцэй. Хто ж такі ліцэіст сёння: як выглядае, чым жыве, аб чым марыць?**

Уявіце сабе юнака ці дзяўчыну ад 15 і крыху старэй. Ліцэіст апранаецца вольна, але не кідка. Часцей за ўсё на ім джынсы, простая кашуля, швэдра. Толькі кожны дзесяты аддае перавагу класічнаму касцюму з гальштукам. Цікава, што ніводзін з апытаных мной не праявіў настальгію па школьнай форме, якая, як вядома, тут не абавязковая.

«Сярэднестатыстычны» ліцэіст гаворыць на 1,32 замежнай мовы (малавата будзе!), а сярод хатніх жывёл больш за ўсё любіць сабаку (зразумела) і... кракадзіла. Ніхто з маіх субяседнікаў не назваў сваёй любімай газетай «Праўду», а тэлевізар большасць уключаюць, калі ідзе «Поле цудаў» ці «Крок». Ёсць у навучэнцаў і любімая страва са школьнай сталовай: двайная порцыя сасісак, ікра чорная (?), а таксама піражкі з ларочка на праспекце Ракасоўскага.

Самыя шчаслівыя дні для ліцэістаў, як і для ўсіх нармальных школьнікаў — субота і нядзеля, а самыя цяжкія — панядзелак і серада (відаць, з-за асаблівасцей раскладу ўрокаў).

Кола захапленняў у навучэнцаў ліцэя не мае межаў. З відаў спорту яны выбіраюць шахматы і каратэ. Цікавяцца хірамантыяй і журналістыкай, любяць пячы кулінарныя вырабы (асабліва хлопчыкі), весці дзённік і нават... іграць на саксафоне і пляваць у столь. Але самым незвычайным і распаўсюджаным хобі аказалася (не паверыце!) вучоба. Так, матэматыкі любяць у вольную хвіліну паламаць галаву над задачамі, радыёфізікі вывучаюць і збіраюць радыёпрылады. Калі на канікулах мала хто аддае сну менш дванаццаці гадзін, то ў час сесіі, запэўнілі большасць рабят, не спяць наогул. Такая настойлівасць у вучобе зразумелая, бо кожны ліцэіст панічна баіцца «вылецець» і вярнуцца ў старую школу. Праўда, некаторыя ўжо не вытрымалі цяжкі вучэбны марафон са шматлікімі перашкодамі і па розных прычынах вымушаны былі сысці з дыстанцыі. Многія хлопцы і дзяўчаты траціць на дарогу больш за гадзіну і гатовы ехаць да месца вучобы хоць на край свету. Што ж так прываблівае іх у ліцэі? Вядома, не толькі перавагі пры паступленні ў БДУ:

— Я магу зайсці ў настаўніцкую і як са старэйшым сябрам пагаварыць з завучам. Паспрабуй у простай школе!

— Тут больш дэмакратыі, вучня паважаюць як асобу,— растлумачылі мае субяседнікі.

Усё было б добра, каб ліцэй меў пастаянную прапіску. Пакуль ліцэісты вымушаны здымаць вуглы на дзвюх прыватных кватэрах (школы № 102 і 189). І таму зразумелая радасць, што гарвыканком, нарэшце, прыняў рашэнне аб выдзяленні для ліцэя няхай невялічкай, але ўласнай кватэры.

Цікава, што нягледзячы на загружанасць, нашы сябры нават хацелі б увесці для вывучэння некаторыя новыя прадметы, напрыклад, псіхалогію, закон божы, «парады аб тым, як весці знешнюю эканамічную дзейнасць». Хапае ў рабят часу і на грамадскія абавязкі. Сярод вучняў ёсць члены камісіі па канфліктах, «вечныя» дзяжурныя і нават «вышыбала» і казначэй.

Ліцэістам не пазычаць фантазіі. Калі я спытаў, якая ў іх ружовая мара, былі такія варыянты адказаў: «Жыць у Швейцарыі», «Стаць свяцілам навукі», «Каб у наш клас далі 20 амерыканскіх камп'ютэраў для вучобы» (высакароднае жаданне), «Добра паесці»...

А сказаць вам па сакрэту, каго многія ліцэісты назвалі сваім кумірам? Ды не, ніякую не рок-зорку. Свайго настаўніка фізікі!

Вось такія яны настойлівыя, жыццярадасныя, непрадказальныя гэтыя ліцэісты. І калі вам, паважаныя чытачы, калі-небудзь сустрэнецца малады чалавек, вясёлы па суботах і крыху не такі па панядзелках, разумны, але зусім не «завучаны», з саксафонам у руках і кракадзілам на павадку, ведайце: гэта і ёсць той самы ліцэіст, пра якога я вам расказаў.

**Партрэт малявалі студэнт факультэта журналістыкі Дзмітрый РУБАШНЫ і Вольга КАЗУНОВА.**

## ДА ДОШКІ ВЫКЛІКАЕЦЦА... НАСТАЎНІК

# Прыемна пазнаёміцца

**Мы прывыклі меркаваць аб настаўніках па тым, як яны вядуць урокі, як апытваюць, якія задаюць дамашнія заданні. І часам забываем, што выкладчыкі — зямныя людзі са сваімі праблемамі і радасцямі. Праводзячы апытанне сярод настаўнікаў ліцэя, яшчэ раз пераканаліся ў тым, як многа мы не ведаем пра іх...**

— ЧЫМ ЦІКАВЫЯ ВАШЫ ВУЧНІ?

Е. А. ФРАНЦКЕВІЧ: Яны мудрыя. З імі можна размаўляць на роўных. Да іх можна смела ісці за дапамогай і падтрымкай. Ім можна верыць і давяраць. На іх можна спадзявацца.

Т. А. КАЛЕВІЧ: Сваёй супярэчлівасцю: з аднаго боку — гэта дзеці, а з другога — дарослыя людзі. І гэта трэба ўлічваць.

А. В. ВІННІЧУК: Самастойнацю поглядаў на навакольны свет.

Е. П. АНДРЭЕВА: Прафесіяналізмам.

Як бачыце, адказы самыя розныя. Але галоўнае тут тое, што ім, як бачна з анкет, цікава з ліцэістамі.

*— ЯК, НА ВАШ ПОГЛЯД, ПАВІННЫ СКЛАДВАЦЦА АДНОСІНЫ ПАМІЖ НАСТАЎНІКАМ І ВУЧНЕМ Ў ЛІЦЭІ?*

А. В. ВІННІЧУК: Ведаю адно — гэтыя адносіны павінны быць у галіне душэўнага камфорта як для вучня, так і для настаўніка.

Ю. Д. ЧУРБАНАЎ: Як нармальныя чалавечыя адносіны паміж старэйшымі і маладзейшымі таварышамі на аснове ўзаемнай павагі.

Е. П. АНДРЭЕВА: На прынцыпах добрасуседства, мірнага суіснавання, неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы адзін аднаго, супрацоўніцтва.

Калі чыталі анкеты настаўнікаў, мы заўважылі адзін вельмі цікавы факт: усе яны з задавальненнем сталі б ліцэістамі, каб мелі такую магчымасць. Толькі Е. П. Андрэева не пайшла б у ліцэй. І яе можна зразумець — тут жа не рыхтуюць гісторыкаў.

Мы задумаліся над гэтым і вырашылі, што ліцэісты не ў праве пазбаўляць сваіх настаўнікаў такой магчымасці: няхай выкладчыкі хоць адзін дзень будуць ліцэістамі, няхай іх мара на кароткі час стане рэальнасцю.

І, нарэшце, мы спыталі нашых настаўнікаў, што б яны хацелі пажадаць нам у дзень, калі ліцэю спаўняецца год.

А. В. ВІННІЧУК: Любіць жыць. І станавіцца прафесіяналамі.

Ю. Д. ЧУРБАНАЎ: Заўжды заставацца Чалавекам. І — поспехаў у іх нялёгкай вучобе.

Е. П. АНДРЭЕВА: Маё пажаданне ліцэістам — стаць ліцэістамі.

Т. А. КАЛЕВІЧ: Стаць прафесіянальнымі ў сваёй справе, таму што няма ніякай карысці ад дылетантаў.

С. Г. БАРЭКА: Паспяховага паступлення ва універсітэт.

С. В. БАГРАНЦАВА: Адчуванняў: радасці ад перажытых дзён, чакання шчасця, упэўненасці ў тым, што жыццё — цудоўнае ва ўсіх яго праявах.

***У сваю чаргу, мы хочам пажадаць нашым настаўнікам, каб іх работа, якую яны так любяць і якой аддаюць столькі сіл, была плённай і прыносіла б радасць і задавальненне.***

**Н. КОРСАК, ліцэістка.**

## Наталья РУСЕЦКАЯ

Давай всё бросим
И уйдем отсюда,
От этой суеты и болтовни.
Закроем ставни,
Заколотим двери. По корке хлеба бросим
в рюкзаки.

Уйдем и все...
Чтоб не нашли нас люди,
И только через многие года
Вернёмся мы
В наш добрый шумный город,
Где будут ждать нас старые друзья.

* * *

Расскажи мне старую сказку
О зеленой солдатской фуражке,
Чтоб поверила я.

О девчонке безумно влюбленной,
Верной, ветреной, смелой и гордой,
Что солдата ждала.

О колонниках шумных и сильных,
Что девчонке букеты носили,
А она не брала...

Расскажи мне еще о том,
Как вернулся солдат домой,
Но вернулся с другой...

## Наталья АНИЩЕНКО

Ранним утром мне приснилась голубая орхидея.
Голубая орхидея ранним утром мне приснилась.
К ней рукой не прикасаясь
и дышать над ней не смея,
Взяла кисти, взяла краски,
чтоб картина получилась...
Но беспомощны все краски.
Ткать из солнца не умея,
Не могу изобразить я ее нежное сиянье.
(Покажи, кто нарисует
нежнолюбящих лобзанье?!)
Будто тайна, мне приснилась голубая орхидея...

* * *

Я сама себе и друг, и враг,
Полководец и цареубийца.
Что-то во мне сделано не так,
И от этого мне суждено разбиться.
Чересчур стихов в моей крови,
Голубой от нежности и неба.
Далеко мне падать до земли,
Где мой разум слишком долго не был.
Не грущу. Не все ли мне равно,
Сколько времени еще я в мире буду?!
Я успела повидать зерно,
Восхититься жизненному чуду.

А Ў ВАС? А Ў НАС!

# ДАЕШ АКТЫЎНУЮ ПРАКТЫКУ!

***Усе спробы параўнаць выпускнікоў педагагічных патокаў БДУ і педінстытута звычайна прыводзілі да аднаго выніку: лічыцца, што ў першых горш ідуць справы з метадычнай і чыста педагагічнай падрыхтоўкай, але веды па прадметах у іх глыбейшыя.***

Няма сэнсу спрачацца, што мае большае значэнне для настаўніка, бо зразумела: валодаць ён павінен і тым, і другім.

Скончыўшы універсітэт і пачаўшы працаваць у школе, нашы выпускнікі на працягу некалькіх гадоў ліквідуюць недахоп метадычных навыкаў, часам так доўга і ўпарта, што ствараецца ўражанне аб поўнай адсутнасці ў іх такой магчымасці ў час вучобы.

Ёсць надзея, што не так часта ў лік падобных гора-спецыялістаў будуць трапляць выпускнікі педагагічнага патока фізічнага факультэта. З 1986—87 навучальнага года яны пачынаюць адчуваць смак настаўніцкіх спроб і памылак ужо на першым курсе, толькі развітаўшыся з роляй вучняў сярэдняй школы. Адбываецца гэта дзякуючы той форме практыкі, якая прынята тут.

Педагагічная практыка стала бесперапыннай ва універсітэтах нашай краіны пасля адпаведнага Загада Мінвуза СССР. Зразумела, што ён не забяспечыў аўтаматычна эфектыўнасць гэтай практыкі, а толькі зацвердзіў пачатак яе на малодшых курсах. З улікам колькасці адведзеных на практыку гадзін з'явіўся тэрмін «пасіўная практыка»: студэнты проста прысутнічаюць на школьных уроках і назіраюць за работай настаўнікаў.

А практыканты малодшых курсаў педпатока фізфака БДУ... не хозяць у школу наогул. Іх вучні наведваюць універсітэт. Тэмы заняткаў, якія з імі тут праводзяцца, не выходзяць за межы школьнай праграмы, але закранаюць яе больш глыбока і больш падобныя на факультатывы, чым на звычайныя ўрокі.

Вядуць заняткі адразу тры студэнты. Рыхтуюцца яны таксама разам: працуюць з выданнямі, складаюць план-канспект будучага ўрока. Кіраўнік педпрактыкі знаёміцца з гэтым планам, уносіць у яго карэктывы, але з першай спробы часцей за ўсё «бракуе» яго. Пасля перапрацоўкі ў самых старанных маладых настаўнікаў атрымліваецца не проста план, а сапраўдны сцэнарый жывога дзеяння пад назвай «урок».

Добрасумленна падрыхтаваўшыся да правядзення такога ўрока, студэнты здатныя выкарыстоўваць на працягу яго наглядныя дапаможнікі і тэхнічныя сродкі навучання, формы гульні і віктарыны. Данесены вучням у такім выглядзе, вучэбны матэрыял добра імі ўспрымаецца і трывала запамінаецца. А студэнты вучацца быць настаўнікамі-партнёрамі, здольнымі весці з дзецьмі роўную, а значыць самую кампетэнтную размову. Пераадольваючы нечаканыя цяжкасці, якія заўсёды суправаджаюць заняткі, яны на практыцы вывучаюць тыя навуковыя палажэнні, якія давядзецца ім чытаць у падручніках па методыцы і педагогіцы.

За работай студэнтаў назірае школьны настаўнік іх цяперашніх вучняў. Нярэдка ён імкнецца ўмяшацца ў ход урока — зрабіць заўвагу самаму шумліваму з вучняў, падказаць што-небудзь разгубленым «педагогам». Але ў ідэальным варыянце яны здольныя ўтраіх размеркаваць паміж сабою цяжкія моманты заняткаў.

Яшчэ адзін назіральнік — выкладчык універсітэта, які кіруе педпрактыкай студэнтаў. Ён ацэньвае кожнага паасобку адразу па некалькіх крытэрыях: па іх арганізатарскіх і дыдактычных магчымасцях, экспрэсіўна-моўных і камунікатыўных, па акадэмічных і асабістых якасцях. Такі спосаб выдзялення слабых бакоў пачынаючых настаўнікаў дапамагае ім набыць упэўненасць у тым, што педагог — гэта не толькі ад Бога, але і ад працы. Акрамя таго, пункты пратакола часткова вызначаюць план наступнага ўрока і дапамагаюць выкладчыку-кіраўніку рабіць неабходныя акцэнты ў падрыхтоўцы студэнтаў да практыкі.

У сярэднім студэнты пачатковых курсаў педпатока фізфака праводзяць такі ўрок адзін раз у семестры. Гэта прадастаўляе ім дастаткова часу, каб падрыхтавацца да чарговых заняткаў і захаваць пры гэтым адчуванне, што іх педпрактыка сапраўды бесперапынная. У выпадку ж, калі яна праводзіцца ў так званай «пасіўнай» форме, такога выніку наўрад ці можна чакаць.

Як бачым, аргументаў на карысць актыўнай педпрактыкі дастаткова. Але, на жаль, іх лічаць пераканаўчымі толькі на фізічным факультэце. На астатніх педпатоках нашага універсітэта захоўваюць вернасць «пасіўнай» практыцы і пры гэтым карыстаюцца іншымі аргументамі. Тым, напрыклад, што методыка выкладання, педагогіка і псіхалогія чытаюцца студэнтам педпатокаў на апошніх курсах — як раз тады, калі і адбываецца іх непасрэдная практыка ў школе. А што ж, маўляў, могуць першакурснікі, якія не вывучылі такіх асноватворных курсаў універсітэцкай праграмы?

Адказ на гэта пытанне напрошваецца ў выглядзе пытання. Што ж могуць гэтыя першакурснікі, калі прыходзяць да заканчэння універсітэта, «абцяжараныя» ведамі па псіхалогіі, методыцы і педагогіцы? Здаецца, яны па-ранейшаму захоўваюць рэпутацыю не моцных у гэтых дысцыплінах. І магчыма, дзякуючы адсутнасці ў іх паўнацэннай педпрактыкі на першых курсах?

**В. ЗНІЧКА.**

ЦІ ПРАЎДА, ШТО...

# Двайнік правадыра
## БЫЎ ПАДОБНЫ НА СТАЛІНА БОЛЬШ, ЧЫМ ЁН САМ

**Некалькі гадоў назад па канадскім радыёвяшчанні на рускай мове ў аглядзе канадскай прэсы прагучала сенсацыйнае журналісцкае паведамленне аб ненатуральным існаванні двайніка Сталіна — нейкага Яўсея ЛЮБІЦКАГА. Названы артыкул быў напісаны супрацоўнікам газеты «Сітызен» Іллёй ГЕРАЛАМ спецыяльна для манрэальскай «Зе Гэзет».**

**19 гадоў І. Герал працаваў у савецкай журналістыцы. У 1977 годзе за ўдзел у руху дысідэнтаў быў пазбаўлены савецкага грамадзянства і дэпартыраваны з СССР.**

Калі ў студзені 1981 года памёр Яўсей Любіцкі, у савецкіх газетах не з'явілася ніводнага некралога. Для савецкай грамадскасці яго прозвішча нічога не значыла. Любіцкі ж на працягу 15 гадоў выконваў не зусім звычайную ролю двайніка Сталіна. Яго асабістае жыццё было вераломна перарвана ў адзін са жнівеньскіх дзён 1935 года ў невялікім украінскім гарадку Вінніца, дзе працаваў ён тады сціплым бухгалтарам. Быў Любіцкі самым звычайным чалавекам. Вылучала яго хіба што адно: незвычайнае падабенства са Сталіным, ці, так будзе больш дакладна, з партрэтамі вялікага правадыра. У той дзень перад домам Любіцкага спыніўся чорны аўтамабіль. Афіцэры службы Дзяржбяспекі, якія выйшлі з яго, не клапаціліся аб правядзенні рытуальнага ў такіх выпадках вобыску, не імкнуліся адшукаць прычыны арышту.

«Ну што ж, Любіцкі,— звярнуліся яны да мяне,— развітвайся з сям'ёй. Паедзеш з намі».

Праз два дні ён апынуўся на шыкоўным падмаскоўным лецішчы, дзе вакол яго былі служачыя, якія, бы глуханямыя, не адказвалі ні на адно з яго пытанняў. Любіцкі не ведаў, што пра ўсё гэта думаць.

Неяк на лецішча прыбыла цэлая група цырульнікаў, краўцоў, грымёраў і без адзінага слова тлумачэння ўзялася «апрацоўваць» Любіцкага.

«Зразумела, пасля таго я зрабіўся больш падобным на Сталіна, чым ён сам. Кожны, хто бачыў самы вядомы яго партрэт, быў упэўнены, што гэта сапраўды Сталін. Нават той недалёкі мастак, які маляваў. Але ж гэта пазіраваў я».

Ужыванне у ролю Сталіна заняло больш чым паўгода. На лецішча прыбыў сам Сталін, каб пабачыць перароджанага Любіцкага. Застаўся вельмі задаволены. Прапанаваў выпіць за сустрэчу. Правадыр падзякаваў сціпламу бухгалтару з Вінніцы за тое, што той усвядоміў грамадзянскую значнасць даручанага яму задання.

«Ніколі б не падумаў, што Сталін, які выглядаў так прывабна на партрэтах, быў такога невысокага росту, руды, з залатымі зубамі і гаварыў з такім нясцерпным грузінскім акцэнтам. Была ў ім адна ледзь бачная асаблівасць: у яго поглядзе праглядваўся незвычайна ясны розум, аб'яднаны з апантанай рашучасцю. Магу пацвердзіць, што нават яго варожыя вусы валодалі прыцягальнай сілай».

Крыху пазней Любіцкі ўпершыню іграў сваю ролю на людзях, з'явіўшыся ў якасці Сталіна на сустрэчы з дэлегацыяй шахцёраў. Увесці ў зман гарнякоў было няцяжка— яны ніколі не бачылі Сталіна. Справай больш складанай было пераканаўча сыграць ролю перад перакладчыкам і абслугоўваючым персаналам Крамля — яны ж не раз сустракаліся з сапраўдным шэфам. Аднак атрымалася і гэта. Так Любіцкі завалодаў правам па-ранейшаму жыць на лецішчы і мець нават у самыя цяжкія гады вайны ўсё: далікатэсы, фільмы, жанчын.

Сталін любіў пажартаваць. Пакідаў сваё месца Любіцкаму, калі з дакладам прыходзіў Яжоў. Сталін назіраў праз акенца з другога пакою. Вельмі яго забаўляла, што Яжоў дазваляў сябе правесці.

Нішто аднак не магло параўнацца па сіле эмацыянальнага ўздзеяння з тым хваляваннем, якое ахоплівала Любіцкага, калі з'яўляўся ён перад натоўпам на трыбуне Маўзалея ў гадавіну рэвалюцыі або 1 Мая. Бліжэйшыя паплечнікі Сталіна Вячаслаў Молатаў, Лазар Кагановіч і Георгій Малянкоў не маглі не заўважыць відавочнае: на трыбуне побач з імі стаяў дублёр.

«Не ведаю, чаму,— успамінае Любіцкі,— але памятаю, якая лютая нянавісць з'яўлялася ў іх вачах, калі глядзелі яны на мяне. Магчыма, і яны жадалі мець уласных дублёраў?»

За некалькі месяцаў да смерці Сталіна Любіцкі нечакана быў арыштаваны і сасланы на далёкую Поўнач. Без надзеі на вяртанне. Атрымалася так, што менавіта тады, калі абвясцілі прысуд аб ссылцы яго на сумна вядомы востраў у Белым моры, прыйшла вестка аб смерці Сталіна.

Любіцкага вызвалілі. Праўда, вымушаны быў ён падпісаць абавязацельства жыць толькі ў сярэдняй Азіі і нікому не распавядаць гісторыю свайго жыцця.

Ш-Ш-ША!

# Усе змеі... у госці да нас

***Так-так, «Экзоты свету»! Магчыма, гучыць некалькі прэтэнцыёзна для выставы ў Траецкім прадмесці, на якую завіталі рэптыліі, абраўшыя месцам жыхарства беларускую зямлю.***

***Гэта гадаванцы аматарскіх калекцый, а таксама экспанаты, якія прадстаўляюць аб'яднанне «Спектр» і навукова-вытворчая фірма «Несси».***

На вуліцы халадэча, а ў зале выставы — цяпло і, нягледзячы на небяспечнае суседства, утульна. «Экзоты» ж песцяцца ў спецыяльных вальерах са штучным падсветам. «Гэтыя даволі-такі мілыя стварэнні, напэўна, велізарныя капрызы,— падумала я.— Тым больш, што амаль у кожнай пад бокам тэрмометр, ртутны слупок якога запаўзае пад трыццаціградусную адзнаку».

...Вось фарсіць белымі гарошынамі на смаліста-чорных баках цудоўны жучок, змахваюць на нейкіх матылёў дзіўныя чырванаватыя прусакі, а вялікіх яшчарак, якіх называюць варанамі, я прыняла адразу, забыўшы ўсе азы заалогіі, за кракадзілавых дзетак.

Затое ў лупатых крабах не наблытала нічога. Смешна было назіраць, як адзін з іх ляніва прагульваўся па дну акварыума, у той час як астатнія яго сабраты аддавалі перавагу пустому байленню часу.

Па суседству з «лупатымі» — чарапахі. Адны з іх — тыя, што пасаджаны ў пясок, з галавой акунуліся ў свае панцырныя домікі і былі нерухомыя, таму здавалася, што яны нежывыя. Другія ж — у акварыуме, нязграбна боўталіся і перакульваліся ад малога да вялікага ўсім чарапашым сямействам.

У ліку асабліва каштоўных экспанатаў — квакшы. Самых нечаканых зялёных колераў і адценняў. Такіх «абуральна нелагічных», што ў існаванне гэтых дзівацтваў матухны-прыроды ніхто не асмельваўся паверыць. Большасцю глядацкіх галасоў было вырашана, што квакшы — пластмасавыя. Па чыёйсьці здагадцы — і не пластмасавыя наогул, а зробленыя з пластэліну і пакрытыя лакам.

Патрэбна сказаць і пра самых шматлікіх. Без усялякіх сумненняў — гэта змеі. Павольныя і свабодныя яны ў руху, працякаючы ў пяску лёгкім падатлівым струменем. А як прыгожа глядзяцца мускульныя пералівы цела. Глянцавітая, у вычурных узорах скура проста бездакорная — лускавінка да лускавінкі. І ніводнага дэфекту.

Гавораць, у некаторых краінах вы можаце зрабіць жанчыне надзвычайны камплімент, параўноўваючы яе (не ведаю дакладна, у якіх, праўда, якасцях) са змяёй.

Але не толькі і не столькі гэтым характэрныя дзіўныя змеі ды і ўсе астатнія паўзуны, што прадстаўлены на выстаўцы. Назіранне за дзікімі жывёламі, на думку англійскіх вучоных, садзейнічае зніжэнню дэпрэсіі.

Так што, спяшайцеся пабачыць рэптылій! Штодня з 10 да 20 гадзін, без выхадных. Да 4 сакавіка.

**С. САВАШЫНСКАЯ,**
**слухачка аддзялення журналістыкі ФГП.**




**Пасля знаходжання ў Мінску невялікай групы іспанскіх студэнтаў паміж маладзёжнымі арганізацыямі дзвюх краін завязаліся нядрэнныя кантакты.**

**І вось паездка, якую доўга чакалі, ажыццявілася.**

**Мы імкнуліся як мага больш даведацца аб гэтай краіне і яе людзях, іх норавах і звычках, аб палітычным жыцці і эканоміцы. Мы задаволілі сваю цікаўнасць. У прыватнасці, зрабіць гэта нам дапамагло пражыванне ў іспанскіх сем'ях.**

**Пяць дзён знаходжання ў райскіх умовах праляцелі як некалькі гадзін, але новых сяброў, якія з'явіліся ў іншай дзяржаве, забыць будзе нялёгка.**

**А. ГУСАК,**



**Фота аўтара.**
**Мінск — Мадрыд — Мінск.**

# Зварот
## САВЕТА СТАРШЫНЯЎ ПРАФКОМАЎ ВНУ Г. МІНСКА Ў ВЯРХОЎНЫ САВЕТ БССР

**Прадстаўнікі навуковай і тэхнічнай інтэлігенцыі выказваюць вялікую заклапочанасць становішчам, якое склалася да пачатку 1991 года ў забяспечанасці сродкамі навуковых даследванняў. Разумеючы сённяшнюю сітуацыю ў фарміраванні дзяржаўнага бюджэту, мы лічым, што выйсце з гэтага становішча можна знайсці толькі на аснове далейшага развіцця навукі і выкарыстання навукова-тэхнічнага патэнцыялу.**

**У той жа час аналіз праектаў законаў БССР, што рэгламентуюць парадак выкарыстання сродкаў, «адпушчаных на навуку», выяўляе шэраг іх істотных недахопаў. Дадатковую нявызначанасць і нервовасць выклікае тое, што няма надзеі атрымаць неабходныя сродкі да канца студзеня гэтага года для іх размеркавання. Фактычна навуковыя калектывы бяздзейнічаюць.**

**Нашы прапановы зводзяцца да наступнага:**

**1. Пры распрацоўцы і зацвярджэнні Законаў «Аб падатках...», «Аб навукова-тэхнічнай дзейнасці...» і інш. прадугледзець падатковыя ільготы для навуковых арганізацый сістэмы народнай адукацыі, стаўка падаткаў (па ўсіх састаўляючых) павінна быць не больш чым 40—45 працэнтаў.**

**2. Дапушчальны памер фонда аплаты працы усталяваць не менш 60 працэнтаў у даходзе прадпрыемства;**

**3. Усталяваць нарматыў на ўтварэнне зарплаты дзяржбюджэтных НДР у памеры 60 працэнтаў ад аб'ёму работ;**

**4. Увесці для рэспублікі адзіныя крытэрыі фондаўтварэння і стаўкі падаткаабкладання незалежна ад віду прадпрыемства, форм яго ўласнасці і юрыдычнай прыналежнасці. Не дапусціць неабгрунтаваных разыходжанняў (у 2 і больш разоў) у аплаце працы работнікаў адной кваліфікацыі, якія належаць да розных навуковых арганізацый (АН БССР, ВНУ, НТТМ, навукова-тэхнічныя кааператывы і г. д.), акрамя выпадкаў, абгавораных заканадаўствам.**

**Па даручэнню старшынь прафкомаў БДУ, БПІ, МРТІ, БТІ, МДПІ, МДПІЗМ, БДІНГ**
**І. РУХЛЯ,**
**старшыня Савета.**

# МАЙСТРОЎНЯ

Валерый ПАЗНЯКЕВІЧ

## Сустрэча

У паветры імжэў уедлівы дождж. Жоўтая вязкая гліна кайданамі чаплялася за ногі. Людзі хаваліся пад вялікія капялюшы парасонаў. Я спыніўся каля школы і вылез з машыны.

— Ва-ло-дзя! Гэй!

Нечый знаёмы голас паклікаў мяне ззаду. Я азірнуўся.

Малады чалавек сярэдняга росту ў шэрай прамоклай кепцы махаў мне рукой.

— Што, чорт стары, не пазнаеш?

— Саня, Санечка, а ты адкуль тут узяўся?

Праз некалькі хвілін мы ўжо сядзелі ў машыне і размаўлялі аб жыцці.

— А ты памятаеш Таньку Шыцік, ну тую самую чарнявую дзяўчынку, у якую я быў закаханы і падвозіў яе на веласіпедзе дамоў? Ты яшчэ злаваўся на мяне заўсёды, таму што вымушаны быў ехаць на свой хутар адзін.

— Зразумела. Яна яшчэ цыдулку кідала табе на ўроку праз дзверы, і наша класная прачытала яе ўслых. Вось сенсацыя была, уся школа тады гаварыла пра вас.

Раптоўны грузны стук у дзверцу спыніў нашу размову.

— Гэй, вадзіцель, здавай узад, высыпай вугаль.

Машына нервова ўздрыганулася і пакацілася назад.

— А ты даўно на машыне працуеш?

— Ды не, гады два. А ты куды знік?

— А вось у школе вартаўніком нядаўна ўладкаваўся. Стыпендыі не даюць, дык і восемдзесят рублёў дарэчы.

— А ты што, яшчэ не скончыў філфак?

— Не, ды гэта не я, жыццё такое. Заляцеў пару разоў з гэтым (пстрыкае пальцам па горлу), прыйшлося круціцца, акадэмку браць, а зараз, як бачыш. Ну, ды што я ўсё пра сябе, вылазь, зойдзем да мяне ў старажоўку, пагрэемся. У мяне ёсць цудоўная рэч. Слова даю, ты яшчэ такой не піў.

— А-а-а, дзе наша не прападала, пайшлі!

У старажоўцы ўжо сядзелі некалькі чалавек. На стале ляжала тонка нарэзанае сала і паўбуханкі хлеба.

— Ну, дзе ты прапаў, як пайшоў, дык і з канцамі. Мы вось закусь прынеслі... Давай, што там у цябе ёсць?

— О, гэта рэч! — Саня залез пад ложак, дастаў адтуль нейкую дзіўную бутэльку і пачаў круціць яе над галавой. — Мы будзем сёння піць бычыны цэпень.

— Давай, не дражніся, разлівай.

Пасля некалькіх чарак мужыкі разгаварыліся, пачалі ўспамінаць, што два дні назад пілі змяіную гарэлку. Саня прыцмокваў языком і казаў, што гэта была самая лепшая рэч з тых, якія ён мог дастаць.

Мне стала зразумела, адкуль ён даставаў гэтыя цэпні. Як добра ўсё ж такі, што я выліў свой келішак на дол.

Эх, Саня, Саня. Саня Гудзевіч...

Хлопцы раскідалі карты, штурхалі адзін другога пад бок. Саня сядзеў на лаўцы, звесіўшы галаву, і ўжо ціха пасопваў. Нібыта не хацеў нікому перашкаджаць.

Успаміналіся школьныя гады, сустрэча ўсіх аднакласнікаў пасля службы ў войску. Як добра, што мяне чакае дома жонка, та самая Танька, якая кідала мне калісьці цыдулкі.

Сяржук СЯНКЕВІЧ

## Сон

*Я далёка лячу ў паднябессе*
*І лагодную бачу зямлю,*
*Дзе зубры засыпаюць у лесе.*
*Мне здаецца, што нават не сплю.*
*Рэчка срэбная ззяе на сонцы,*
*Хвалі звонам крыштальным пяюць.*
*Кветкі ў полі бурштынам каронным*
*У карагодзе пад ветрам снуюць.*
*Як пачнуўся — убачыў я поле*
*Разадранае вострым плугом;*
*Зубр пануры стаяў у няволі,*
*Абдзіраў хвойку тупа рагом.*
*Рэчка жоўтая ціха маўчала.*
*Не відно нават рыбкі на дне.*
*А душа ж так нядаўна лятала!*
*Як шкада, што было гэта ў сне.*

## РАЗВІТАННЕ МІЦКЕВІЧА

(Санет)

Жалобным смуткам плакала катрынка.
Жальбой пякучай пела ёй душа.
У лесе, як у храме, зноў імша.
Тут моліцца вятрыска між галінкаў.
Паэт маўчаў, а падалі сняжынкі,
Бялюткі снег пакрыў сабой абшар.
І вырвацца з-пад тых зялёных чар
Маглі адны зялёныя ялінкі.
Ім авалодаў успамін кахання,
Якое ўжо чакала расставання,
Але жыве яшчэ надзея,
Пунсовая, як вылітая кроў,
Агнём рабін у сэрцы палымнее
І выльецца ў радкі сугуччам слоў.



## Авангарднае каханне

Зноў турбуе мяне блакіт.
Хвалі Свіцязі — бы гараць.
Вочы цвёрдыя, як граніт,
З дзікім полымем. І маўчаць.
Адным словам, тут — прыгажосць.
Толькі раніць яна — балюча,
Як у сэрца — ад стрэлаў — косць,
Але ж погляд Яе — гаючы!
Невядома, каго любіць:
Ці святло, што з зарой іскрыцца,
Ці то цвёрды — з вачэй — граніт,
Аб каторы не змог разбіцца.
Не скажу табе цёплых слоў,
Бо гульня ў нас адна — маўчанне.
Ці ад сонца ўскіпела кроў,
Ці ад роспачы. Час растання.
Хвалі Свіцязі зноў гараць,
Хвалі літасці і кахання.
Мо і хопіць было б маўчаць,
Калі час той прыйшоў.
Растанне.

АНТОН АРЦЁМЕНКА

*Я бачу бязмежнасць асобы,*
*Бо ўсё-ткі не мару аб ёй,*
*Спрадвечныя марныя спробы*
*Не ўзяў я задачай сваёй.*
*Ці ж зброя, цкаванне, аблава*
*Скасуюць (вялікай бяды!)*
*Маё неад'ёмнае права*
*Застацца сабой назаўжды?*

*У агні запаветнай свабоды*
*Хачу я пакуты цярпець,*
*Ды думак маіх карагоды*
*Не хочуць у бездань ляцець.*
*Якая прыходзіць няслава?*
*Калі, і каму, і куды*
*Аддаў незайздроснае права*
*Застацца сабой назаўжды?*

*З тых пор па вуголлях блукаю*
*Чаго ж гэта я самаходзь*
*На ўласную вольніцу*
*Зграі*
*Дазволіў накінуць аброць?*
*Бяссілле нявечыць крывава.*
*Ці ўдасца праз енкі нуды*
*Вярнуць растаптанае права*
*Застацца сабой назаўжды?*



## Цыганскае вяселле

Імчаліся коні, спявалі гітары.
Пранеслася чутка, што гэта рамалы.
Палілі кастры, танцавалі да ранку:
Вяселле ў цыган, у рамалаў гулянка.
Ім ноч падарыла ўсё неба ў зорках,
І цокалі коні падковамі звонка.
Ляцела кібітка бы вецер вясновы,
З цыганскаю песняй, з цыганскаю мовай.
Агонь калыхаўся і слухаў гітару,
А я закахаўся ў цыганскую мару.
Аб шчасці спрадвечным і песнях вясёлых,
Аб канях даверлівых, крадзеных конях.

## Спатканне

Нешта шэпча табе вечар пра мяне
І хавае мае вочы ў туманы.
І сустрэча ўжо ніяк не праміне,
Калі ты кахаеш шчыра, без маны.
Разбуджу вясёлым цоканнем падкоў,
Пасаджу цябе на вернага каня.
Украду, як кралі ў глыбіні вякоў,
Няхай шчыруе нас кветкамі зямля.
Буду косы твае пекна цалаваць
І расу з травы са смакам буду піць.
Калі зможаш хоць аднойчы пакахаць,
Ужо проста немагчыма разлюбіць.
Абвянчаюць нас з табою каласы,
Будзе сватам першы сонечны прамень.
А за сваццю кроплі ранішнай расы,
Што змачылі твае ногі да кален.

Алесь ПАШКЕВІЧ

## Нябесная сірвента

Калі сірочая сляза
сцячэ па дымкія ўракосы
І на расплеценыя косы
узляжа востры бляск ляза,
закончу я сваю малітву.
ГАСПОДЗЬ, благаславі
на бітву!
Каваль з адсечанай рукой
падорыць стомленыя похвы,
разбіты шлем ды меч,
што змог бы
і без крыві знайсці спакой.
Душу на горан ускладу,
з'яднаўшы дух і боль жалеза,
ды на курган самотным бэзам
з падковай зробленай прыйду.
Мой конь раструшчыць цішыню
на сонных кветках зверабою...
ГАСПОДЗЬ, дай зорнай моцы
вою,
дай неўміручасці каню.

## Сымону Блатуну УЗЫХОДЖАННЕ

Боскі выраз твару
Лашчыць фотаздымак.
А ля сэрца мара
Туманом застыла.
У санлівым небе
Не хапае волі...
Уратуйце долю.

Калыша вецер душы настрой,
а я шыбую насустрач ветру.
Яшчэ б падняцца на метраў сто
і застанецца паўкіламетра...
А там вяршыня агорне нас.
Прытуліць сэрцам сваім трохкутным
Страхую рукі і ўвесь Каўказ,
каб лёс сяброўскі не стаў пакутным.



## Ворагам

Вы не параніце каня.
На ім шчэ стрэмя.
Яшчэ успеніцца зрання
адважных племя.
Вы не астудзіце мяча.
Гарыць крывёю
лязо сталёвага пляча,
бы вочы воя.
Вы не прымусіце мяне
закрыць ілбіцу.
Падманам сэрца не мігне.
Згарыць зарніца.
Калі ж душа аб боль
грудзей
скрывавіць крылы,
я не хачу, каб плач людзей
кранаў магілы...

## Альба (Табе)

Запалі агні,
каханая мая...
(З песні)

Яго Правялебнасцю лёсам
душа на кавалкі разбіта.
Кпіць весела зорнае сіта
над месяца зломленым носам.
Ваўчыцамі скаляцца зоры,
клыком раздзіраючы грудзі.
А ўнізе наіўныя людзі
у ноч пасылаюць дазоры...
Бялее дарогай да Храма
істужка ад Млечнага шляху.
Сутонне нябеснага даху
малюе аконная рама.
Аблокі шукаюць вазніцу,
каб змог нам прывезці світанак.
Мне цёмна ў свеце... Мой
ранак,
хутчэй запалі мне газніцу.

* * *

Цвік у столь...
Праз разбітае шкло
холад грудзі кране.
Стаў цягнік,
жыццё адышло
у шматкроп'е крыві
на акне.
Пульс крыві.
Драцяная пятля.
шыю лашчыць іржой.
Ціш у роце,
званок-немаўля
скрыжаваннаю сплятае
павой.
Шпалаў бег,
пераезд праляцеў
семафораву сінь.
Стань пабліз,
хто такога хацеў,
і на рэйках маркоту
пакінь.

Ульяна ВЕРИНА

Из золота вечерние дома,
Оно стекает из закатных стонов,
От них горит на крышах хохлома,
Она берется с повзрослевших кленов.
Когда же ночь затянет чернотой
Ленивых горизонтов трепыханье,
Последний луч погаснет золотой
И прекратится осени дыханье.
Потом дома зазолотятся вновь,
И вновь рассвет польёт богатство стонов,
И из обрывочных фрагментов медных снов
Я составляю одеянье кленов...

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

7 лютага

Зак. 2053.

Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.